

# За смугою стагоддзяў

## *Вусная народная творчасць*

Цудоўны скарб у творчасці народнай
Для нас сабраны мудрымі дзядамі.
Яго адкінуць — значыць без пашаны
Паставіцца да продкаў працавітых.

*Уладзімір Дубоўка.*

**Неабходна ведаць**

- Чым адметныя народныя казкі, легенды, загадкі, прыказкі, прыкметы і павер'і.

**Пажадана навучыцца**

- Цікава расказваць вывучаныя казкі і легенды.
- Складаць (па магчымасці) уласныя казкі і загадкі.

**Варта задумацца**

- Чаму беларускі народ з пакалення ў пакаленне перадаваў і захоўваў вусную народную творчасць?
- Чаму сучаснаму чалавеку трэба вывучаць, зберагаць і прапагандаваць фальклор свайго народа?



Правообладатель Национальный институт образования

## Літаратурная размінка

У пачатковых класах вы пазнаёміліся з рознымі жанрамі вуснай народнай творчасці. Вызначце, якім жанрам фальклору адпавядаюць прыведзеныя творы або ўрыўкі з іх.

| Творы або ўрыўкі з іх | Жанры фальклору |
|---|---|
| 1. Добра таго вучыць, хто хоча ведаць. | а) скорагаворка; |
| 2. Не куст, а з лісточкамі, не кашуля, а сшыта. | б) песня-калыханка; |
| 3. Дзятлы дзюбамі дзяўблі дзеравяшку. | в) прыкмета; |
| 4. Вароны садзяцца на верхавіны дрэў — будзе вецер. | г) загадка; |
| 5. Баю-баюшкі-баю,<br>Не лажыся на краю.<br>Не лажыся на краёк,<br>Прыйдзе шэранькі ваўчок,<br>Ён ухопіць за бачок. | д) казка; |
| 6. Жавароначкі, прыляціце,<br>Зямлю-матухну абудзіце<br>І дожджыкам напаіце,<br>Каб травачкі нарасціла<br>І волікаў накарміла. | е) прыказка; |
| 7. Касіў на лузе касец. Змарыўся і сеў пад кустом адпачыць. Дастаў торбачку, развязаў і пачаў есці. Выходзіць з лесу галодны воўк. Бачыць — касец пад кустом сядзіць і нешта есць.<br>Падышоў да яго воўк:<br>— Ты што ясі, чалавеча?<br>— Хлеб, — адказвае касец… | ж) песня-вяснянка |



Правообладатель Национальный институт образования

## Пра вусную народную творчасць

За шматлікія стагоддзі сваёй гераічнай гісторыі наш таленавіты народ стварыў найбагацейшую духоўную спадчыну — безліч цудоўных паданняў, легенд, казак, песень, загадак, прыказак, прыкмет і павер'яў. Гэтыя творы вусна (паколькі яшчэ не было пісьмовай літаратуры) перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Кожны, хто расказваў легенду, казку ці спяваў песню, звычайна забываўся на нешта ў змесце або свядома замяняў, дадаваў сваё, фантазіраваў, прыдумляў. З цягам часу імя першага аўтара забывалася, і вусныя творы станавіліся калектыўнымі. Таму мы зараз гаворым, што аўтар нашага духоўнага нацыянальнага багацця — народ.

Вусную народную творчасць яшчэ называюць **фальклорам**, што ў перакладзе з англійскай мовы азначае 'народная мудрасць'. Фальклорныя творы былі цесна звязаны са штодзённым жыццём чалавека. Яны ўвабралі ў сябе веды, вопыт многіх пакаленняў беларусаў, іх назіранні за навакольным светам, роздум пра месца чалавека ў ім. У фальклоры ўвасоблены духоўныя памкненні і спадзяванні нашых продкаў. Таму вусную народную творчасць лічаць паэтычнай гісторыяй народа.

У старажытнасці вусная народная творчасць была непарыўна звязана з іншымі відамі мастацтва: танцамі, народнымі гульнямі, святамі і відовішчамі. Нацыянальны фальклор і сёння жывіць творчасць беларускіх пісьменнікаў сваімі сюжэтамі і вобразамі.

**1.** Калі і як узнікла вусная народная творчасць?
**2.** Якія фальклорныя творы вы ведаеце?



Правообладатель Национальный институт образования

# НАРОДНЫЯ КАЗКІ

## Літаратурная размінка

Прыгадайце свае любімыя беларускія народныя казкі. Патлумачце, чым яны вам падабаюцца.

## Пра казкі

**Казка** — займальны аповед пра неверагодныя і фантастычныя падзеі і прыгоды.

Відаць, няма на свеце дзяцей, якія не любілі б казак. Праўда, і дарослыя часта праяўляюць да іх цёплыя пачуцці, хоць і не заўсёды ў гэтым прызнаюцца. Чаму ж людзі так лагодна ставяцца да гэтых народных твораў? Казкі здзіўляюць нас сваім багаццем, захапляюць зместам, зачароўваюць гучаннем. У іх адлюстравана мара нашых далёкіх продкаў пра лепшую долю.

У казках заўсёды перамагаюць дабро і справядлівасць, высока цэняцца людская дружба і ўзаемадапамога, сумленнасць і надзейнасць.

У *чарадзейных* казках дзейнічаюць незвычайныя героі (казачныя асілкі, волаты) і простыя людзі, смелыя, працавітыя, знаходлівыя. Ім дапамагаюць добрыя чараўнікі, сілы прыроды, жывая і мёртвая вада, жывёлы і розныя істоты — конь, ваўчыца, свінка, птушка, рыбка. Асобную ролю выконваюць цудадзейныя прадметы: чароўны меч, дудачка, гуслі-самагуды, боты-скараходы, дыван-самалёт, тапор-самасек, цудоўны збанок, залатыя рэчы (пярсцёнак, яблык, пяро, яблынька). Казачныя героі змагаюцца са злом і заўсёды выходзяць пераможцамі. Ім супрацьстаяць страшныя істоты, надзеленыя звыш-



Правообладатель Национальный институт образования